ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (1130) ● Чацвер, 13 мая 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

Сёння ў нумары:

⊙ НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ ⊙ КАМСАМОЛЬСКАЕ ШЭФСТВА — ПРАБЛЕМЫ І ЗАДАЧЫ ⊙ ФПК — ШКОЛА ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА ⊙ РАЗМОВА ПРА ТРОЙКУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА... ⊙ СЯБРА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ⊙ ВЯСНА СПАРТЫЎНАЯ.

ПРЫСВЕЧАНЫЯ ПЕРАМОЗЕ

Ва універсітэце напярэдадні 31-й гадавіны з дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі адбыліся дзве канферэнцыі чытачоў.

Першая прайшла на геаграфічным факультэце. Шматлікая аўдыторыя абмяркоўвала кнігу Д. В. Цябута «Скрозь агонь». Аўтар — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны — расказаў у сваім творы аб дзейнасці Ветрынскага падпольнага райкома партыі Віцебскай вобласці. Дзмітрый Васільевіч — былы сакратар гэтага райкома; у час вайны ён быў камандзірам партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава. На канферэнцыі прысутнічаў былы член гэтай брыгады (камандзір спецыяльнай падрыўной групы), цяпер — пісьменнік Алесь Савіцкі.

Барацьбе народных мсціўцаў супраць гітлераўскіх захопнікаў у ліхую гадзіну вайны былі прысвечаны выступленні студэнтаў геафака Л. Барушкі, І. Бачылы, Т. Тачонай, А. Гусевай, М. Шуплякова, А. Сінягуба, А. Шкарупы. Усе прысутныя азнаёміліся са спецыяльна аформленай кніжнай выстаўкай «Народныя мсціўцы». Канферэнцыя была зазнята на плёнку і 7 мая дэманстравалася па Беларускаму тэлебачанню.

— Калі краіна пакліча, мы маладыя, станем на абарону заваёў нашых бацькоў і дзядоў, на абарону рубяжоў Радзімы! — гэта словы з выступлення студэнткі мехмата Н. Сабадашавай на другой канферэнцыі чытачоў, якая прайшла на механіка-матэматычным факультэце па кнізе М. І. Аляксеева «Па закліку сэрца». У канферэнцыі прыняў удзел сам аўтар — генерал-маёр у адстаўцы, стары камуніст, удзельнік сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, пісьменнік Мікалай Іванавіч Аляксееў. Праз лёс герояў кнігі праўдзіва раскрыты баявыя падзеі Ржэўска-Вяземскай і Смаленскай аперацый 1942—1943 гг.

«Вечна будуць у памяці народнай імёны герояў, паўшых і жывых!» — гэтыя словы сталі дэвізам канферэнцыі. У заключэнне ганаровым гасцям былі уручаны сувеніры, кнігі, кветкі.

Абедзве канферэнцыі былі падрыхтаваны і праведзены бібліятэкай БДУ (аддзел абслугоўвання), факультэтамі, кафедрай рускай савецкай літаратуры. Праводзіліся яны ў рамках тыдня славы герояў.

С. УСЦІНОВІЧ.

СУВЯЗЯМ МАЦНЕЦЬ І ПАШЫРАЦЦА

ВАЖНАЕ значэнне ў дакументах XXV з'езда КПСС і V пленума ЦК ВЛКСМ набыло масавае разгортванне шэфскай работы над будоўлямі і прадпрыемствамі, сельскімі школамі і домакіраўніцтвамі, прафесійна-тэхнічнымі вучылішчамі. Шэфствуючыя арганізацыі павінны стаць праваднікамі ўсяго самага перадавога, дзейсным прыкладам на кожным участку работы.

Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна звязана цеснымі сувязямі дружбы з 30 гарадскімі і сельскімі школамі Мінска і Мінскай вобласці, 12 домакіраўніцтвамі і 7 прафесійна-тэхнічнымі вучылішчамі, з некалькімі камсамольска-маладзёжнымі калектывамі прамысловых прадпрыемстваў горада, воінскімі часцямі. Як бачна, фронт работы значны. Неабходна адразу ж заўважыць, што гэта работа далёка не на ўсіх факультэтах задавальняе нас. Вельмі доўга і часта амаль безвынікова ідзе наладжванне кантактаў факультэтаў са сваімі падшэфнымі ў першым семестры навучальнага года. Летам жа гэтыя з цяжкасцю наладжаныя сувязі парываюцца; зноў прыходзіцца ўсё пачынаць спачатку. На нашу думку, шэфская работа па-сапраўднаму павінна разгарнуцца ў першыя месяцы вучобы, тым болей, што яны не надта абцяжарваюць студэнта. Трэба наладжваць сувязі не ў кастрычніку-лістападзе, а ў час сельскагаспадарчых работ. Ужо тут, на «бульбе», трэба, каб акадэмічныя групы выпрацоўвалі свае планы, прапановы, з якімі па прыездзе ў ВНУ змаглі б пайсці да сваіх падшэфных.

Робячы рэйды і праверкі шэфскай работы, літаральна на кожным кроку сутыкаешся з нядобрасумленнасцю, лянотай членаў нашых педатрадаў, якія працуюць у піянерскіх і дзіцячых пакоях пры домакіраўніцтвах. Яны павінны стаць другімі пасля школьных настаўнікаў выхавацелямі разумнага і прыгожага. Між тым шэфская работа часам выліваецца ў фармальнасць — студэнт сядзіць у пустой зале піянерскага пакоя, а падапечныя блукаюць па вуліцы, сумуючы па цікавай справе ці занятку. Такія адносіны да свайго пачэснага абавязку толькі падрываюць аўтарытэт нашых лепшых педатрадаў.

Студэнты III курса гістарычнага і філалагічнага факультэтаў абавязаны прайсці так званую піянерскую практыку. Раней гэтая практыка ў іх праходзіла як работа ў падшэфных домакіраўніцтвах і летніх піянерскіх лагерах. Але вось ужо два гады дзейнасць педатрадаў не залічваецца як піянерская практыка. Гэтая акалічнасць у вялікай ступені абумовіла зніжэнне якасці работы педатрадаў. На наш погляд, трэба аднавіць старую традыцыю або хаця б залічваць практыку лепшаму педатраду.

Камітэт камсамола універсітэта выступіў з прапановай узяць шэфства над прафесійна-тэхнічнымі вучылішчамі. Бюро Кастрычніцкага РК ЛКСМ Беларусі, гарком падтрымалі нашу ініцыятыву. Многія пункты планаў і абавязацельстваў паспяхова выкананы. Цікава прайшлі выезды агітбрыгад і выступленні факультэцкіх тэатраў мініяцюр. Арганізавана чытаюцца лекцыі па прававому і эстэтычнаму выхаванню, працуюць гурткі «Наш Ленінскі камсамол», адбыліся сумесныя вечары, «агеньчыкі», канферэнцыі чытачоў і г. д. На жаль, далёка не заўсёды камсамольскія работнікі падшэфных арганізацый дапамагаюць нам наладжваць цесныя сувязі з факультэтамі. Так, напрыклад, па віне падшэфных з ГПТВ-107 сарваліся кансультацыі і дадатковыя заняткі па фізіцы і матэматыцы, падрыхтаваныя камсамольцамі фізічнага факультэта. Прадстаўнікі шэфскага сектара біялагічнага факультэта дамовіліся з завучам сярэдняй школы № 24 г. Мінска аб правядзенні на факультэце 11 сакавіка «Дзён адкрытых дзвярэй». Але ў вызначаны час старшакласнікі ва універсітэт не прыйшлі. Канешне, і ў нас ёсць выпадкі несумленных адносін да шэфскай работы. Не заўсёды на высокім узроўні чытаюцца лекцыі нашымі студэнтамі.

Вялікую цяжкасць выклікае шэфства над сельскімі школамі. Аддаленасць ад горада, недахоп транспарту і іншыя прычыны ўскладняюць задачы. Праўда, значных поспехаў у рабоце з сельскімі школьнікамі дабіліся геаграфічны і філалагічны факультэты. Але іх падшэфныя школы знаходзяцца, як кажуць, за ваколіцай. У астатніх школах усю шэфскую работу прыходзіцца абмяжоўваць перадачай бібліятэчак кніг, чытаннем лекцый па прафарыентацыі, прыёмам на факультэтах школьнікаў — выдатнікаў вучобы, наладжваннем «Дзён адкрытых дзвярэй». Значна пашырыць гэтую работу можна ў час «бульбы». Трэба дабівацца, каб пэўныя камсамольскія групы працавалі іменна ў тым калгасе або саўгасе, дзе знаходзіцца падшэфная школа.

У другім семестры гэтага года па ініцыятыве секцыі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў савета шэфскага сектара камітэта камсамола БДУ ўведзены штомесячныя справаздачы аб выкананні мерапрыемстваў. Першапачаткова звесткі збіраюцца непасрэдна ў падшэфных арганізацыях, а пасля звяраюцца са звесткамі шэфскіх сектараў факультэтаў. Гэтая мера палепшыла якасць работы з падшэфнымі, удасканаліла сістэму кантролю за выкананнем прынятых абавязацельстваў. У гэтым жа семестры мы ўпершыню выкарысталі сістэму ацэнак шэфскай работы за месяц па пяцібальнай шкале. Дух спаборніцтва дапамагае выправіць хібы, накіроўвае на пошук новых форм работы з падшэфнымі. Дарэчы, аб новых формах. 30 сакавіка на філалагічным факультэце быў падпісан дагавор аб супрацоўніцтве паміж калектывам Красненскай сярэдняй школы і камсамольскай арганізацыяй філфака. Вопыт заключэння такіх дагавораў мэтазгодна будзе распаўсюдзіць і на іншых факультэтах.

Задачы і мэты ў нас, шэфаў, і кіраўнікоў падшэфных установ і арганізацый агульныя; працаваць нам трэба разам, натхнёна. Неабходна толькі, каб шэфскія сувязі з году ў год пашыраліся і мацнелі.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
член бюро камітэта камсамола універсітэта, старшыня савета шэфскага сектара.

● УВАГА: КАМСАМОЛЬСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

ТРАДЫЦЫЯ ПАЧЫНАЕ ЖЫЦЬ

Радзіма вялікага беларускага паэта Янкі Купалы — Вязынка стала месцам І злёту студэнтаў-філолагаў БДУ імя У. І. Леніна. Злёт, прайшоўшы пад дэвізам «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — майстэрства і пошук маладых», быў прысвечан 31-й гадавіне Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Даўняя дружба звязвае філолагаў універсітэта з месцамі, дзе нарадзіўся і жыў народны пясняр. Кожная новая сустрэча з Вязынкай для будучых літаратуразнаўцаў — гэта магчымасць больш глыбока зразумець велічэ творчай спадчыны паэта, яго багаты ўнутраны свет, духоўную непарыўную сувязь з роднай беларускай зямлёй.

Ад'язджаючы на радзіму паэта, філолагі ўсклалі кветкі да памятнага мемарыяльнага Знака выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, загінуўшым у баях за вызваленне Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Памяць пра тых, хто ў смяротным баі выстаяў і перамог, каго так натхнёна заклікаў у сваіх «Партызанах» Янка Купала, студэнты клянуцца захоўваць у сваіх сэрцах вечна.

Падрыхтоўка да злёту ўключыла ў сябе спаборніцтва на лепшую групу, арганізацыю і правядзенне працоўнага дэсанта, грамадска - палітычную практыку студэнтаў, Ленінскі ўрок. У ходзе падрыхтоўкі была праверана гатоўнасць студэнцкіх будаўнічых атрадаў факультэта да трэцяга працоўнага семестра 1976 года.

Адным з лепшых атрадаў факультэта быў прызнан атрад «Буравеснік». Лепшым камандзірам і камісарам было прадастаўлена права падняць сцяг злёту.

Цёплымі словамі прывітання злёт адкрыў дэкан факультэта А. А. Волк.

— Няхай гэта наша свята стане яшчэ адным сведчаннем усенароднай любві і прызнання вялікаму песняру зямлі беларускай! — такімі словамі закончыла сваю прамову выступіўшая на ўрачыстым адкрыцці Я. С. Раманоўская, пляменніца Янкі Купалы. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры В. А. Захарава расказала аб тым, як у цяжкія гады бітваў натхнялі на бой савецкіх людзей палымяныя радкі паэта.

Сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна А. Тозік выказаў упэўненасць, што правядзенне злёту філолагаў на радзіме Янкі Купалы ў

(Заканчэнне на 3-й стар.).



Новыя вершы чытае Л. ТАРАСЮК.

РАДКОМ ІНФАРМАЦЫІ

✲ **За актыўную работу ў органах народнага кантролю Камітэт народнага кантролю СССР узнагародзіў намесніка старшыні групы народнага кантролю БДУ Алену Андрэеўну Акінчыц Ганаровай граматай.**

* * *

✲ **Пачаўся прыём заяў абітурыентаў на завочнае навучанне. Расказвае адказны сакратар прыёмнай камісіі Аляксандр Уладзіміравіч Царук:**

— Адбылося пасяджэнне членаў прыёмнай камісіі. На восем спецыяльнасцей завочнага факультэта ўжо пададзены першыя заявы абітурыентаў. Члены прыёмнай камісіі разгледзелі пытанне аб допуску гэтых людзей да ўступных экзаменаў.

Сёлета, як і ў мінулым годзе, усе даныя па прыёму заяў будуць апрацоўвацца на ЭВМ па падсістэме «Абітурыент».

Я. ШЛОЎКІС.

✲ **Сапраўдным святам дружбы, музыкі стаў І фестываль палітычнай песні, які праходзіў з 6 па 9 мая ў Латвійскім дзяржаўным універсітэце імя П. Стучкі. На фестывалі сабраліся студэнты з Масквы, Горкага, Свярдлоўска, Адэсы, Харкава, Ерэвана, з Польскай Народнай Рэспублікі. Сваімі музычнымі кампазіцыямі, песнямі, танцамі яны выказвалі гарачую салідарнасць з усімі народамі, якія змагаюцца за свабоду і незалежнасць. «Няхай жыве дружба!», «Чылі пераможа!» — громам авацый, стоячы, віталі прысутныя вакальна-інструментальны ансамбль студэнтаў Перу, Чылі і Аргенціны з універсітэта Дружбы народаў імя П. Лумумбы.**

На фестывалі прысутнічалі студэнты фізічнага факультэта БДУ: А. Зайцава, А. Бялова, А. Седзяга, Г. Піцэвіч. Яны не толькі прысутнічалі, але і прынялі ўдзел у фестывалі. На гэтым прадстаўнічым форуме нашы рабяты былі адзначаны спецыяльным прызам камітэта камсамола Латвійскага універсітэта.

Н. ШАЎЧЭНКА.

ШКОЛА ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА

ФПК: НАДЗЁННЫЯ ПРАБЛЕМЫ

ВЯДОМА, што наш універсітэт заслужана ліцыцца флагманам ВНУ рэспублікі. У апошнія гады універсітэт ператварыўся таксама і ў школу перападрыхтоўкі кадраў. Аб гэтым сведчыць тое, што ў ім, побач з інстытутам павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук, адкрыты і функцыянуюць два факультэты павышэння кваліфікацыі. На адным з іх праходзяць перападрыхтоўку выкладчыкі грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў. За 8 гадоў з часу адкрыцця гэтага факультэта тут павысілі сваю кваліфікацыю звыш васьмісот чалавек. Гэта выкладчыкі гісторыі, палітэканоміі, грамадазнаўства, этыкі, эстэтыкі і іншых грамадскіх дысцыплін.

Слухачы кожнага новага набору ФПК, займаючыся чатыры месяцы, маюць магчымасць слухаць лекцыі высокакваліфікаваных спецыялістаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта па найбольш актуальных праблемах марксісцка - ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, навуковага камунізму, гісторыі КПСС, педагогікі, псіхалогіі, навуковай арганізацыі працы і інш.

Хочацца сказаць цёплыя словы ў адрас выкладчыкаў - ветэранаў, якія працуюць на ФПК з часу яго арганізацыі. Гэта загадчык кафедры навуковага камунізму доктар філасофскіх навук, прафесар Н. Г. Круцько, доктар гістарычных навук, прафесар Г. М. Трухноў; кандыдаты гістарычных навук дацэнты Г. Г. Герасіменка, Д. Б. Мельцар, М. А. Пашкевіч; кандыдат філасофскіх навук дацэнт М. Я. Ленсу; кандыдат псіхалагічных навук дацэнт Р. І. Вадэйка і іншыя.

Усе слухачы ФПК праходзяць педагагічную практыку ў лепшых сярэдніх спецыяльных навучальных установах і прафтэхвучылішчах горада, робяць вучэбныя экскурсіі на буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы, наведваюць памятныя гістарычныя месцы горада-героя Мінска, абменьваюцца асабістым вопытам педагагічнай дзейнасці, пастаянна папаўняюць свой навуковы багаж трывалымі ведамі, расшыраюць агульны кругагляд.

Разам з тым хацелася б адзначыць, што ў рабоце факультэтаў ёсць цяжкасці і недахопы. Мы яшчэ не дабіліся, каб усе лекцыі чыталіся на аднолькава высокім ідэйна - тэарэтычным узроўні, больш увагі трэба ўдзяляць методыцы выкладання грамадскіх дысцыплін, азнаямленню з тэхнічнымі сродкамі навучання. Пытанні работы прафесарска-выкладчыцкага саставу на ФПК яшчэ не сталі аб'ектам пільнага разгляду на адпаведных кафедрах, якія, згодна з дырэктыўным палажэннем, павінны забяспечваць вучэбны працэс на факультэце. Ухіленне гэтых і іншых недахопаў, пастаяннае ўдасканальванне ўсёй вучэбна-метадычнай работы на ФПК — залог паспяховага росту педагагічнага майстэрства слухачоў факультэта.

П. БОРСУК,
дэкан ФПК, дацэнт.

УЛІЧВАЦЬ СПЕЦЫФІКУ

Скора слухачы ФПК паедуць да сябе дамоў. Цікава, якія ўражанні яны павязуць пра факультэт, чаму яны навучыліся? Наш карэспандэнт папрасіў слухача факультэта выкладчыка палітэканоміі Ашмянскага сельгастэхнікума Г. К. НАЦЭЎСКАГА і выкладчыка грамадскіх дысцыплін Гродзенскага палітэхнікума Ю. Р. ШЭСТАКА расказаць аб гэтым.

Г. К. НАЦЭЎСКІ. На ФПК я ўжо другі раз. Упершыню быў слухачом факультэта ў 1971 годзе. Першыя ўражанні яны павязуць пра факультэт, чаму яны навучыліся? Наш карэспандэнт папрасіў слухача факультэта выкладчыка палітэканоміі Ашмянскага сельгастэхнікума Г. К. НАЦЭЎСКАГА і выкладчыка грамадскіх дысцыплін Гродзенскага палітэхнікума Ю. Р. ШЭСТАКА расказаць аб гэтым.

Г. К. НАЦЭЎСКІ. На ФПК я ўжо другі раз. Упершыню быў слухачом факультэта ў 1971 годзе. Першыя ўражанні я вынесу ад сустрэчы з выкладчыкамі, якія чыталі лекцыі па гісторыі КПСС, палітэканоміі, навуковаму камунізму. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі нашы лектары — выкладчыкі універсітэта. Тое ж самае было і цяпер, у год XXV з'езда КПСС. Не забыць таксама міжвузаўскай канферэнцыі, на якой нам была прадастаўлена магчымасць пачуць даклады многіх вядомых вучоных рэспублікі і краіны.

У гэтым годзе я прыняў удзел у праверцы вучэбна-выхаваўчай работы ў Навапольскім тэхнікуме, праводзімай па заданню Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Ю. Р. ШЭСТАК. Вось ужо другі раз я на факультэце: першы — у 1971 годзе, другі — у гэтым годзе. Вучоба дала многае: я паглыбіў свае веды па гісторыі КПСС, палітэканоміі, навуковаму камунізму і іншых дысцыплінах.

Вязу таксама яркія і прыемныя ўражанні ад экскурсіі на мінскія аўтамабільны і трактарны заводы.

Вучэбны працэс на факультэце ў асноўным складаецца з лекцый і лекцыйна-практычных заняткаў. Хто з выкладчыкаў вам запомніўся, якія дысцыпліны вам было цікава слухаць?

Г. К. НАЦЭЎСКІ. На гэтае пытанне не можа быць адназначнага адказу. Справа ў тым, што ўзровень падрыхтоўкі слухачоў розны, ды і выкладаюць яны ў сябе розныя грамадскія дысцыпліны. Таму адных лектараў мы слухаем з вялікай цікавасцю, другіх з меншай.

Мне спадабаліся лекцыі кандыдата філасофскіх навук, дацэнта М. Я. Ленсу, кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Г. М. Пашкоўскага — ён чытаў курс па навуковаму камунізму. Глыбінёй ведаў, грунтоўнай аргументацыяй выдзяляліся лекцыі па гісторыі КПСС кандыдата гістарычных навук, дацэнта Г. Г. Герасіменкі.

Ю. Р. ШЭСТАК. Увогуле ў кожнай лекцыі выкладчыкаў, якія праводзяць з намі заняткі, мы знаходзім шмат цікавага і карыснага.

Тым не менш вялікае ўражанне на мяне аказалі выступленні кандыдата эканамічных навук, дацэнта У. А. Кулажанкі, доктара гістарычных навук, прафесара М. Е. Шкляра.

Скора кожны з вас пакіне сцены універсітэта. Што б вы маглі пажадаць факультэту ў яго рабоце на будучае?

Г. К. НАЦЭЎСКІ. Знаходжанне на факультэце дае шмат карыснага.

Аднак, на мой погляд, яшчэ больш увагі патрэбна ўдзяляць асвятленню найбольш актуальных праблем педагогікі, псіхалогіі, медыкі выкладання грамадскіх дысцыплін з улікам спецыфікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафтэхвучылішч. Калі слухаеш курс другі раз, хочацца пачуць што-небудзь новае.

Ю. Р. ШЭСТАК. Хочацца дадаць, што патрэбна яшчэ лепш прадумаць пытанні самастойнай работы слухачоў, а гэта дапаможа нам больш рацыянальна выкарыстаць час знаходжання на ФПК.

З цікавай лекцыяй па тэме «Актуальныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Балгарыі» перад слухачамі ФПК выступіў загадчык кафедры палітычнай эканоміі Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага, прафесар эканомікі Н. Г. ПАПОЎ.

Фота **Т. Петрашкевіч.**

НОВЫ ЗАРАД

XXV з'езд КПСС, які намеціў грандыёзныя задачы на дзесятую пяцігодку, патрабаваў далейшага павышэння ролі грамадскіх навук у камуністычным будаўніцтве. І кожны з нас, слухачоў факультэта, усведамляе гэтыя патрабаванні партыі і разумее, што самай неабходнай умовай паспяховай работы выкладчыка грамадскіх дысцыплін з'яўляецца не толькі глыбокае і ўсебаковае веданне свайго прадмета, але і дэталёвае авалоданне метадалагічнымі асновамі марксісцка - ленінскай навукі, пастаянная работа над яе засваенне. І ў гэтым вялікую дапамогу аказвае нам факультэт павышэння кваліфікацыі пры Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.

Работа факультэта з першых дзён заняткаў нашага набору ўмела арганізавана. Слухачы маюць выдатныя ўмовы для заняткаў ва універсітэце і самападрыхтоўкі ў інтэрнаце; бібліятэка універсітэта забяспечвае ўсёй неабходнай літаратурай.

Несумненна, павышэнне кваліфікацыі на факультэце з'явіцца новым зарадам для ўдасканалвання выкладчыцкага майстэрства і будзе садзейнічаць паляпшэнню камуністычнага выхавання кадраў сярэдняга звяна.

У. ЦАБО,
выкладчык Гродзенскага тэхнікума фізічнай культуры, заслужаны настаўнік БССР.

ТОН ЗАДАЮЦЬ КАМУНІСТЫ

З 45 чалавек, якія займаюцца на факультэце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, 32 з'яўляюцца членамі КПСС. У партыйнае бюро выбраны таварышы, якія маюць вопыт работы ў якасці сакратароў пярвічных партыйных арганізацый. Сакратаром партыйнай арганізацыі выбран камуніст Г. І. Флоча з Малдаўскай ССР. У партбюро створаны вучэбна-метадычны, ідэйна-выхаваўчы, культурна-масавы і бытавы сектары. У плане работы партыйнай арганізацыі мы намецілі ажыццяўленне кантролю за наведваннем заняткаў і выкананнем вучэбнага плана слухачамі. Камуністы прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі наведвання музеяў, тэатраў.

План, намечаны партбюро, ужо ў значнай ступені выкананы. Мы праслухалі лекцыі аб міжнародным становішчы, аб амерыканскім ладзе жыцця, прысутнічалі на сустрэчы з міністрам замежных спраў БССР А. М. Гурыновічам.

На факультэце праведзен партыйны сход, на якім быў заслуханы і абмеркаваны даклад дэкана факультэта П. П. Борсука «Аб выкананні вучэбнага плана на ФПК у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС».

Рад курсавых работ слухачы прысвяцілі праблемам выкарыстання матэрыялаў XXV з'езда КПСС у выкладанні грамадскіх дысцыплін.

Факультэт павышэння кваліфікацыі — гэта не толькі лекцыі, семінары, практыка. Гэта яшчэ і актыўная грамадска-палітычная работа.

Па даручэнню райкома партыі 17 чалавек правяралі стан палітыка-выхаваўчай работы ў сталовых. Наведвалі палітзаняткі, гутарылі з прапагандыстамі і прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, прачыталі лекцыі аб XXV з'ездзе КПСС.

Камуністы факультэта прымалі ўдзел у праверцы стану палітыка-выхаваўчай работы на радзе прадпрыемстваў Беларускай чыгункі. Многія слухачы па просьбе Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР правялі арганізацыю вучэбнага працэсу ў мінскіх тэхнікумах.

Для азнаямлення з сучаснай вытворчасцю былі праведзены экскурсіі на буйныя прадпрыемствы сталіцы Беларусі. Слухачы наведалі заводы аўтаматычных ліній, халадзільнікаў, трактарны.

А напярадзе яшчэ многа цікавага: экскурсія па гораду, на Курган Славы; затым — экскурсія ў Ленінград, у горад-герой Брэст і ў Белавежскую пушчу.

А. СТАНКЕВІЧ,
выкладчык палітэканоміі Пружанскага саўгаса-тэхнікума Брэсцкай вобласці.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ СЯМ'Я

Састаў слухачоў факультэта па праву можна назваць інтэрнацыянальным. На ФПК сабраліся выкладчыкі з розных гарадоў і рэспублік краіны, прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей — рускія, беларусы, украінцы, літоўцы, латышы, малдаване, эстонцы і іншыя.

Сустрэлі нас цёпла і гасцінна, размясцілі ў добраўпарадкаваным інтэрнаце. Многія з нас прыбылі ў Беларусь, у яе сталіцу горад-герой Мінск упершыню. Вялікае ўражанне выклікала ва ўсіх нас высокая культура мінчан, размах жыллёвага будаўніцтва, універсітэт з велізарнай колькасцю студэнтаў, выдатная бібліятэка з вялікімі чытальнямі і навуковымі заламі, мінскія тэатры і многае іншае.

За час вучобы мы змаглі не толькі папоўніць свае веды, але і пасябраваць. Гэтаму садзейнічала правядзенне сумесных вечароў, культпаходы ў тэатры, на выстаўкі, экскурсіі. Асабліва мне запомнілася выдатная ігра артыстаў тэатра імя Янкі Купалы.

Але галоўнае для нас — гэта, вядома, вучоба. І, гаворачы аб гэтым, нельга абысці маўчаннем работу прафесарска-выкладчыцкага саставу БДУ. Выкладчыкаў, якія чытаюць нам лекцыі, можна назваць майстрамі сваёй справы.

За гады дзейнасці ФПК накоплен каштоўны вопыт у арганізацыі і правядзенні вучэбна-выхаваўчай работы. Я думаю, што час вучобы ва універсітэце на ФПК для многіх з нас надоўга застанецца ў памяці, а веды, атрыманыя за гэты час, дапамогуць нам выхоўваць нашых вучняў сапраўднымі савецкімі людзьмі, высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

С. МАЎРЫЦАЙТЭ,
выкладчык ГСПТВ-42, г. Клайпеда, Літоўская ССР.

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ павышэння кваліфікацыі «веснавы» набор сабраў 45 выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін тэхнікумаў і прафтэхвучылішчаў рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі, РСФСР і Малдавіі. 45 чалавек, 45 педагогаў, 45 прафесіяналаў. Сярод нас ёсць людзі і з 30-гадовым стажам, і з вопытам работы ў пяць гадоў.

Яшчэ і яшчэ раз пераконваемся мы ў тым, якую вялікую карысць прыносяць нам гэтыя заняткі. Справа нават не столькі ў колькасным баку. Так, мы зноў слухаем лекцыі па пятнаццаці курсах, рыхтуемся да семінараў, «абнаўляем» старое, пазнаём новае. Але павышэнне кваліфікацыі — гэта не толькі «што», але ў многім і «як». Таму што мы — практыкі. Метадычная падрыхтоўка, яе ўдасканальванне — для нас гэта вельмі важна. Аб гэтым хочацца сказаць яшчэ некалькі слоў.

КАРЫСЦЬ НЕСУМНЕННАЯ

Усе слухачы пабывалі на ўроках сваіх калег у мінскіх тэхнікумах і вучылішчах. Гэта афіцыйна называецца пасіўнай практыкай, але магу смела сцвярджаць, што ў сэнсе карысці — як абмен вопытам, знаёмства з кабінетамі, пастаноўкай пазакласнай работы і г. д. — практыку гэту можна назваць актыўнай. Мы сталі сведкамі выдатна пастаўленага педагагічнага працэсу па грамадазнаўчых дысцыплінах у ГСПТВ-32, умела арганізаванай пазакласнай работы ў ГПТВ-25, унікальнага «Тыдня эстэтыкі» у ГСПТВ-9 і многае іншае.

Мы атрымліваем метадычны «зарад» на лекцыях В. А. Ванцэвіча, але з не меншым задавальненнем і карысцю праходзяць і абмеркаванні пісьмовых метадычных распрацовак, зробленых калегамі — слухачамі. Шырыня тэматыкі гэтых распрацовак дазваляе ўсім нам задаволіць метадычны голад, які адчуваюць выкладчыкі. Ад методыкі работы над ленінскай тэмай да вузкіх «урочных» тэм — вось аб'ём 45 пісьмовых работ. Хочацца падкрэсліць, што тэмы работ не навязваліся, а прапаноўваліся, і ўсе слухачы выбралі сабе тэмы па душы. Усе яны былі прыняты, усе былі выкананы, многія на высокім узроўні і атрымалі выдатныя ацэнкі рэцэнзентаў.

Вольнае абмеркаванне прафесіянальных пытанняў, праблем прынесла і карысць, і задавальненне слухачам. Вядаць, ёсць сэнс (многія з нас лічаць, што гэта неабходна) распрацоўкі, прызнаныя лепшымі, сабраць у зборнік і надрукаваць іх.

Н. ЦЫПІС,
выкладчык грамадазнаўства ГПТВ-38 г. Мінска.



● УВАГА: КАМСАМОЛЬСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

ТРАДЫЦЫЯ ПАЧЫНАЕ ЖЫЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

дзень Вялікай Перамогі стане новай знамянальнай традыцыяй у гісторыі камсамольскай арганізацыі універсітэта. Гэты злёт — вынік творчай ініцыятывы камсамольцаў-філолагаў і камітэта камсамола філфака.

У праграме злёту — пасадка алеі Дружбы, час паэзіі, працоўны дэсант, купалаўская віктарына, выступленне агітбрыгады, спартыўныя мерапрыемствы. Студэнты-стажоры з ГДР, Рэспублікі Малі, прыняўшыя актыўны ўдзел ў злёце, пасадзілі першыя са ста саджанцаў будучай алеі Дружбы.

Ля помніка Янку Купалу адбыўся час паэзіі. Маладыя галасы пачынаючых паэтаў, удзельнікаў літаратурнага аб'яднання «Узлёт», А. Пісьмянкова, А. Марука, К. Жука прагучалі ўвасабленнем купалаўскай мары пра светлае будучае беларускай паэзіі. З новымі вершамі, увайшоўшымі ў першы зборнік, які рыхтуецца да выхаду ў свет, выступіла аўтар, аспірантка БДУ Любоў Тарасюк.

Захапляючым было спартыўнае свята, у праграму якога ўвайшлі спартыўна - турыстычная эстафета, спаборніцтвы па розных відах спорту паміж атрадамі і курсамі. Дружнымі апладысментамі сустрэлі жыхары Радашковіч выступленне агітбрыгады факультэта. Вершы і песні ваенных гадоў доўга гучалі ля святочнага кастра, якім закончыўся першы злёт студэнтаў-філолагаў.

У. МАРТЫНАЎ, В. ГАЙ-ДЗЯЛЯНКА.

Фота **М. Бажко** і аўтараў.

АД СЕСІІ ДА СЕСІІ

НАБЛІЖАЕЦЦА летняя сесія, дачытваюцца апошнія лекцыі, падыходзяць к канцу практычныя заняткі... Ужо зараз можна сказаць, што багаж ведаў у кожнага студэнта розны. У чым прычына? Час семестра для ўсіх аднолькавы, бібліятэчныя фонды існуюць для кожнага, лабараторыі і метадычныя кабінеты працуюць спраўна.

Наш факультэт, як і ўсе іншыя, хвалююць праблемы павышэння паспяховасці студэнтаў. Усяго паспяваючых на факультэце 91,7 працэнта; маюць тройкі 555 студэнтаў, вучацца толькі на «здавальняюча» 108 чалавек, з іх 55 першакурснікаў.

Як вядома, на фізічны факультэт праводзіцца вялікі набор студэнтаў. Абітурыенты — выпускнікі школ—практычна не адчуваюць канкурэнцыі. Ды і ўзровень падрыхтоўкі першакурснікаў вельмі розны. На першым курсе ідзе адсеў людзей, трапіўшых «не па прызначэнню», выроўніваецца на базе універсітэцкай падрыхтоўкі ўзровень ведаў.

КАЛЕКТЫЎ У АДКАЗЕ

У № 15 нашай газеты быў змешчан артыкул «Вакол праблемы тройкі». Сёння размову працягвае студэнтка II курса фізічнага факультэта Вольга МАЗУРЭНКА, адказная за акадэмічны сектар камітэта камсамола фізфака.

Многія цяжкасці ствараюцца ў выніку недахопу літаратуры, асабліва для першакурснікаў. Яны яшчэ не ўвайшлі ў рытм працы, не заўсёды правільна і поўна могуць весці канспект.

Многае залежыць ад наведвання заняткаў. І не толькі ад наведвання, але і ад уменння засвоіць тое, аб чым гаворыць выкладчык на лекцыі. Камітэт камсамола і вучэбна-выхаваўчая камісія фізфака многае зрабілі для таго, каб арганізаваць кантроль за наведваннем і паспяховасцю студэнтаў, асабліва I—II курсаў. Заканамерна тое, што іменна сярод студэнтаў, дазволіўшых сабе «свабоднае наведванне», — асноўная маса непаспяваючых, асноўная маса троечнікаў. Тых, хто не лічыцца са сваімі студэнцкімі абавязкамі, мы выклікаем на бюро патокаў і кафедр, разглядаем іх справы на ВВК, у камітэце камсамола; да іх прымаюцца меры адміністрацыйнага пакарання, накладваюцца камсамольскія спагнанні. Шмат увагі гэтаму пытанню ўдзяляецца і ў насценным друку факультэта.

Мы лічым, вельмі многае залежыць і ад кантролю за работай староста. Староста можа і павінен прымусіць студэнта працаваць, а калі трэба—дапамагчы, параіць. Між тым часта старосты аказваюць гультаям «мядзведжыя паслугі».

Але староста — гэта толькі часцінка калектыву. ТРЭБА, КАБ КОЖНЫ КАМСАМОЛЕЦ АДЧУВАЎ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАСПЯХОВАСЦЬ У ГРУПЕ, ЗА СТАН СПРАЎ У СВАІХ ТАВАРЫШАЎ. Сама атмасфера ў групе ўплывае на паспяховасць: чым цікавей жыць студэнту, чым больш часу ён занят патрэбнай і захапляючай справай, чым мацней ён адчувае падтрымку таварышаў, іх гатоўнасць прыйсці на дапамогу, тым лепш ён будзе вучыцца. Добра, калі ўзаемадапамога ў групе — справа звычайная, паўсядзённая. Не ўсякі студэнт адважыцца падысці да выкладчыка і спытаць незразумелае; затое да свайго таварыша — з задавальненнем, калі ўпэўнен, што той заўсёды падзеліцца сваімі ведамі, растлумачыць, дапаможа. Такіх груп на факультэце многа. Перш за ўсё адзначу камсамольскія арганізацыі, якія выклікалі на спаборніцтва групы пад лозунгам «НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ!».

Хочацца, каб такіх груп было як мага больш, каб яны паказвалі прыклад іншым калектывам.

СТЫМУЛЮЮЧЫ ТВОРЧЫ РОСТ

У лютым—красавіку 1976 года на хімічным факультэце Белдзяржуніверсітэта па ініцыятыве савета маладых вучоных, камітэта камсамола і дэканата хімічнага факультэта праходзіў агляд-конкурс на лепшую навукова-даследчую работу сярод маладых супрацоўнікаў і выкладчыкаў, прысвечаны 106-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Агляд-конкурс праводзіўся з мэтай павышэння кваліфікацыі і паскарэння творчага росту маладых вучоных-хімікаў. На ім было прадстаўлена 26 работ маладых вучоных, з іх 8 ад кафедры неарганічнай хіміі, 5 работ з кафедры радыяцыйнай хіміі, па 4 работы з кафедр аналітычнай і фізічнай хіміі, 3 работы з кафедры высокамалекулярных злучэнняў і 2 работы з кафедры арганічнай хіміі. Конкурс праходзіў у два этапы. Першы этап быў праведзен на кафедрах факультэта, дзе былі абмеркаваны і адабраны лепшыя работы прыкладнога і тэарэтычнага характару, якія былі выкананы маладымі супрацоўнікамі факультэта па актуальнай тэматыцы ў розных галінах хіміі на працягу 1975—1976 гг.

На заключным этапе журы прызнала лепшымі работы: О. Герасімовіч, Л. Кісялёвай «Ачыстка сцёкавых вод прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці метадам радыяцыйнай палімерызацыі»; К. Каваленкі «Даследаванне ўплыву вокісных і металаарганічных каталізатараў на тэрмічнае раскладанне і гарэнне мадэльнай сістэмы перхларат амонію — палімер»; Е. Рахманько, Ж. Сарокі «Экстракцыя кіслот амінамі і солямі ЧАО»; А. Сямашкі, М. Міронава «Вывучэнне дзеяння УФ - выпраменьвання на гідравокіс кадмію дыэлектрычным метадам»; В. Сыціна «Аб некаторых новых шляхах сінтэзу 3-окісі—4-піперыдонаў і іх вытворных»; О. Шадыры «Узаемадзеянне аксіалкільных радыкалаў з альдэгідамі».

Т. ГАЕЎСКАЯ, старшы навуковы супрацоўнік кафедры неарганічнай хіміі.

І ГІСТОРЫКІ, І ЛІРЫКІ

У снежні 1975 года на гістарычным факультэце БДУ быў арганізаван новы творчы калектыў — агітбрыгада. Нягледзячы на тое, што калектыў існуе нядоўга, яго ўжо ведаюць ва універсітэце многія. На аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці брыгада была названа адной з лепшых. Але гэтаму папярэднічала вялікая работа ўдзельнікаў агітбрыгады студэнтаў III—IV курсаў факультэта. Яшчэ з лютага праводзіліся сістэматычныя рэпетыцыі, на якіх адпрацоўвалася праграма.

І вось 4 сакавіка, як рэзультат плённай працы, — доўгачаканая перамога. Агітбрыгадзе было даручана выступіць на заключным агульнаўніверсітэцкім канцэрце агляду-конкурсу, які адбыўся 13 сакавіка. Потым калектыў пачаў рыхтавацца да універсітэцкага агляду агітбрыгад.

У красавіку гэтага года студэнты выступалі перад камісіяй абласнога савета прафесійных саюзаў, дзе канчаткова вырашылася, што малады калектыў гістфака будзе прымаць удзел у гарадскім аглядзе агітацыйных брыгад, які адбудзецца з 22 па 25 мая.

Падрыхтоўка да конкурсу вядзецца вялікая. Будучыя гісторыкі абнаўляюць сваю праграму: пішуць сцэнарыі на гумарыстычныя і сатырычныя тэмы, рыхтуюць спектаклі аб жыцці студэнтаў, іх вучобе, быце. У іх праграме паяўляюцца новыя песні, танцы, сцэнкі. Адным з цікавейшых твораў праграмы ў брыгадзе лічаць сатырычную сцэнку «Гісторыкі пра гісторыкаў», а таксама «Сцэну аб раўнадушшы».

Агітбрыгада аб'ядноўвае ў сабе і брыгаду, і тэатр мініяцюр, і таму ў праграме многа сатыры, гумару.

Часта праводзяцца рэпетыцыі, бо конкурс, да якога рыхтуюцца студэнты, вельмі адказны: пераможцу будзе прадастаўлена права паездкі з канцэртнай праграмай па новабудоўлях Паволжа.

В. МАРТЫНЕНКА, слухач вячэрніх падрыхтоўчых курсаў.



Ідуць практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу ў першакурснікаў фізфака. Адказвае студэнт V групы С. Якавенка.

НА ВАРЦЕ ПРЫРОДЫ

Вось ужо другі год рыхтуе кафедра агульнай экалогіі, гідрабіялогіі і аховы прыроды спецыялістаў-біёлагаў гэтага напрамку. Сённяшнія выпускнікі працуюць у інстытуце рыбнай гаспадаркі ў аддзеле заалогіі і паразіталогіі АН БССР, у даследчых лабараторыях і гідраметслужбах, у паляўнічтва-знаўчых падраздзяленнях, галіновых лабараторыях возеразнаўства.

З кожным годам узрастае важнасць навуковых даследаванняў у галіне экалогіі і гідрабіялогіі, таму вялікае значэнне надаецца навуковай дзейнасці кафедры.

Зараз кафедра агульнай экалогіі, гідрабіялогіі і аховы прыроды займаецца даследчай працай па адной планавай тэме і дзвюм гаспадарча-дагаворным. Планавая гідрабіялагічная тэма ўключае ў сябе распрацоўку біялагічнай прадукцыйнасці і энергетычнага балансу згуртаванняў рознатыповых вадаёмаў БССР. На папуляцыйным узроўні і ўзроўні згуртаванняў даследуюцца эфектыўнасці пераўтварэння і ўтылізацыі энергіі жывымі насельнікамі. Ад гэтай эфектыўнасці залежыць колькасць карыснай для чалавека прадукцыі, атрымліваемай з вадаёмаў, і якасць вады, што мае найбольш важнае значэнне. Кафедра ўключана ў сферу даследавання дзейнасці Вілейскага вадасховішча, дзе яна займаецца вырашэннем пытання аб фарміраванні якасці вод для насельніцтва. Штогод студэнты-трэцякурснікі праходзяць на аснове гэтых даследаванняў вучэбную і вытворчую практыку, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы.

Спецыялізацыя студэнтаў па ахове прыроды здзяйсняецца праз удзел у гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работах, якія праходзяць па двух каналах: праз гаспадарчы дагавор з Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў і галіновую лабараторыю возеразнаўства універсітэта. Практыка праходзіць у запаведніках Белавежскай пушчы, на станцыях гідраметслужбы, у аддзеле заалогіі і паразіталогіі. Праводзяцца даследчыя работы сумежных кафедр біяфака. Зараз пры кафедры агульнай экалогіі, гідрабіялогіі і аховы прыроды арганізавана студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя па гідрабіялогіі, на базе якой будуць праводзіцца навуковыя работы.

С. ІВАНОВА.

СПАРТЫЎНАЯ ВЯСНА

Ленінская эстафета

Кожны год напярэдадні дня нараджэння У. І. Леніна ў Мінску праводзіцца лёгкаатлетычная эстафета. Ініцыятарам яе яшчэ ў 1957 годзе выступіў Беларускі універсітэт.

Сёлета на старт выйшлі 1044 удзельнікі — прадстаўнікі сярэдніх школ, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў, вытворчых калектываў і ВНУ сталіцы.

Галоўны прыз разыгралі каманды вышэйшых навучальных устаноў. Як і ў мінулым годзе, перамог Беларускі інстытут фізкультуры. Спартсменам нашага універсітэта дасталася толькі 5-е месца.

Л. СЯЛІЦКАЯ.

Поспех гімнастак

У секцыі мастацкай гімнастыкі, якой кіруе Валянціна Васільеўна Сеўба, займаецца каля 30 дзяўчат. 13 з іх — кандыдаты ў майстры і майстры спорту СССР. Лепшыя з лепшых увайшлі ў зборную каманду БДУ. Сур'ёзная, настойлівая праца трэнера і гімнастак прынесла поспех. Гэтаю вясною наша каманда па мастацкай гімнастыцы заваявала першынство ВНУ рэспублікі і заняла 2-е месца ў матчавай сустрэчы вышэйшых навучальных устаноў краіны.

Новы рэкорд

Людміла Кайгародава (гістфак), выступаючы на XIX Мемарыяле братоў Знаменскіх у Сочы, устанавіла новы рэкорд Беларусі ў скачках у даўжыню — 6 м 54 см. Прыемна, што спартсменцы ўдалося перамагчы сваіх вядомых саперніц, у першую чаргу рэкардсменку краіны Л. Алфееву. Кайгародава шмат трэніравалася, асабліва старанна працавала над тэхнікай скачка і разбегам. Кіравала падрыхтоўкай спартсменкі трэнер М. Д. Фінкінштэйн. Людміла Кайгародава — кандыдат у алімпійскую зборную каманду Савецкага Саюза.

З. РУСАКОВІЧ.

Майстэрства ўзрасло

У красавіку гэтага года на станцыі Крыжоўка праводзілася IX першынство БДУ імя У. І. Леніна па спартыўнаму арыентаванню. Дыстанцыя ў зададзеным кірунку для мужчын складала 7,3 кіламетра з 12 кантрольнымі пунктамі, для жанчын — 3,2 км з 6 кантрольнымі пунктамі. У спаборніцтвах прымалі ўдзел госці з інстытута народнай гаспадаркі, педагагічнага інстытута, завода аўтаматычных ліній, шарыкападшыпнікавага завода. Усяго стартавала звыш 250 арыенціроўшчыкаў. Падведзены вынікі IX першынства універсітэта, якія паказалі, што майстэрства нашых арыенціроўшчыкаў значна ўзрасло. Першае месца заняла каманда фізічнага факультэта, другое — механіка-матэматычнага і трэцяе — каманда юрфака.

Прызёрамі IX першынства сталі студэнт IV курса фізічнага факультэта А. Мялешка, студэнтка II курса юрыдычнага факультэта Н. Лебедзева. Пераможцы адзначаны дыпломамі і каштоўнымі падарункамі.

***

З 22 па 25 красавіка ў ваколіцах Брэста адбыліся IV мнагадзённыя рэспубліканскія спаборніцтвы ВНУ па спартыўнаму арыентаванню «Брэсцкі падснежнік». Каманда БДУ імя У. І. Леніна была прадстаўлена двума дарослымі саставамі і камандай юніёрай. У першыя два дні адбыліся спаборніцтвы па праграме — крос з арыентаваннем у зададзеным кірунку, у трэці дзень — эстафетнае арыентаванне.

Па выніках выступленняў зборнай БДУ з 25 каманд у нас 6—8 месцы. Трэба адзначыць удачнае выступленне нашых юніёраў, набраўшых 30 ачкоў, некалькі слабей выступілі асноўным саставам дарослыя, якія набралі 36 ачкоў за два дні спаборніцтваў. Добра выступілі студэнты фізічнага факультэта — камсорг зборнай па арыентаванню Віктар Бурко і Георгій Жызнеўскі, якія ўпершыню выканалі нарматывы кандыдатаў у майстры спорту. Першы этап спаборніцтваў узначальваў вопытны практык, студэнт IV курса фізічнага факультэта Ігар Ліпай, які на этапе змог фінішаваць першым са значным адрывам ад саперніка. Маладой камандзе універсітэта неабходна фарсіраваць агульнафізічную і спецыяльную падрыхтоўку і рашыць яшчэ рад пытанняў, без якіх немагчыма выступаць стабільна і з высокімі паказчыкамі.

В. АКІМАЎ,
трэнер секцыі спартыўнага арыентавання, выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

Фота В. Драчова.

СЯБРА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

СПОЎНІЛАСЯ 100 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЯДОМАГА СЛАВЯНАЗНАЎЦЫ І. С. СВЯНЦІЦКАГА.

У АСАБІСТАЙ бібліятэцы І. С. Свянціцкага, якая зараз складае асобны фонд аддзела рэдкай кнігі Навуковай бібліятэкі АН УССР імя В. Стэфаніка ў Львове, захоўваецца кніга У. І. Пічэты «История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии, ч. I (до конца XVI века)» (Минск, 1927). На кнізе — даравальны надпіс аўтара, першага рэктара нашага універсітэта: «С сердечным приветом от преданного автора. Пичета». У бібліятэцы І. Свянціцкага ёсць і іншыя універсітэцкія выданні. Аднак што ж гэта за чалавек, які так шчыра цікавіўся беларусістыкай, якому з радасцю дарылі сваю працу беларускія вучоныя і пісьменнікі?

Іларыён Сямёнавіч Свянціцкі (1876—1956), стагоддзе з дня нараджэння якога нядаўна споўнілася, — вядомы ўкраінскі славяназнаўца, доктар філасофскіх навук, прафесар Львоўскага універсітэта. Ён прайшоў доўгі, поўны напружанай працы жыццёвы і творчы шлях — ад цікаўнага, дапытлівага студэнта, што скончыў дзве навучальныя ўстановы (філасофскі факультэт Львоўскага універсітэта і Пецярбургскі археалагічны інстытут), да буйнога, еўрапейскага маштабу вучонага, прызнанага аўтарытэту ў галіне гісторыі некалькіх славянскіх моў і літаратур.

Вялікі ўклад унёс І. Свянціцкі ў станаўленне ўкраінскай беларусістыкі, развіццё дружбы і культурных сувязей паміж украінскім і беларускім народамі. Па сутнасці ён з'яўляецца піянерам беларусістыкі на Украіне. Толькі ў асобе І. Свянціцкага, які актыўна і пастаянна вывучаў беларускую літаратуру як самабытную мастацкую з'яву, яе сувязі з іншымі славянскімі літаратурамі, у першую чаргу ўкраінскай, беларуская тэматыка знайшла ва ўкраінскай славістыцы свайго сталага, зацікаўленага прыхільніка і глыбокага даследчыка.

Першай буйнай беларусазнаўчай працай І. Свянціцкага з'явілася даследаванне «Адраджэнне беларускага пісьменства» (1908), якая спачатку друкавалася (з працягам) у львоўскай газеце «Діло», а пасля выйшла асобнай брашурай. Вучоны расказвае пра беларускую літаратуру пачатку XX ст., якая спакваля пачала абуджацца ад «летаргічнага сну» (словы М. Багдановіча), пра першыя беларускія газеты, асобных беларускіх пісьменнікаў і іх кнігі і інш. Кніжка Свянціцкага адразу была канфіскавана ў царскай Расіі.

У 1913 г. украінскі вучоны піша артыкул «Асновы адраджэння беларускага пісьменства», у якім абгрунтоўвае заканамернасць узнікнення такой з'явы, як беларуская нацыянальная літаратура, вызначае паасобныя напрамкі яе развіцця (польска-беларуская «школа», руска-беларуская «школа», пісьменнікі-беларусы). Гэта выключная тэарэтычная праца нібыта дапаўняе гісторыка-літаратурны агляд «Адраджэнне беларускага пісьменства», узбагачае яго новымі думкамі і назіраннямі. У ёй упершыню ва ўкраінскім друку называюцца некаторыя беларускія пісьменнікі XIX ст., робіцца спроба тыпалагічнага супастаўлення творчасці літаратараў Беларусі і Украіны.

У 1926-27 гг. І. Свянціцкі па запрашэнню навуковай грамадскасці рэспублікі наведаў Беларусь. Ён прымаў удзел у рабоце нарады па рэформе беларускага правапісу, азнаёміўся з працай Інстытута беларускай культуры і Белдзяржуніверсітэта, глядзеў спектаклі БДТ-І (цяпер Акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), сустракаўся з многімі беларускімі пісьменнікамі. Ужо ў наступным 1928 г. Свянціцкі друкуе кніжку «Росквіт культурна-нацыянальнага жыцця Усходняй Беларусі», у якой дарожныя ўражанні сплавіліся з логікай даследчыцкай развагі, падначаленай раскрыццю розных аспектаў уздыму беларускай навукі і культуры пры Савецкай уладзе.

Да фактаў гісторыі, мовы, літаратуры і культуры Беларусі І. Свянціцкі звяртаўся неаднаразова, у самых розных працах («Пачаткі кнігадрукавання на землях Украіны», «Каляды ў плыні стагоддзяў», «Агляд гісторыі славянскага пісьменства на працягу 1826—1938 гадоў» і інш.). Разам з тым ён пастаянна падтрымліваў цікавасць да беларусістыкі ў шматлікіх сваіх калег і вучняў, асабліва пасля векапомных дзён верасня 1939 г., калі Заходняя Украіна ўз'яднялася з УССР, а сам Свянціцкі становіцца прафесарам Львоўскага універсітэта, загадчыкам кафедры славяназнаўства. Аднак партрэт гэтага піянера беларусістыкі на Украіне будзе няпоўным, калі не прыгадаць яшчэ прынамсі двух момантаў яго біяграфіі.

У 1905 годзе І. Свянціцкі становіцца дырэктарам Украінскага Нацыянальнага музея ў Львове (дарэчы, на гэтай пасадзе ён працаваў да 1952 года). Дзякуючы яму ў музеі камплектуецца спецыяльны беларускі аддзел. Сам дырэктар у пошуках розных музейных рэліквій наведвае Беларусь у 1905, 1906 і 1908 гг. Менавіта ў тых паездках адшукаліся, а ў музеі зберагліся да нашага часу бясцэнныя каштоўнасці, якія маюць непасрэднае дачыненне да беларускай культуры. Так, сённяшнія наведвальнікі львоўскага Музея ўкраінскага мастацтва могуць убачыць 23 слуцкія паясы, 12 кніг «Бібліі» Ф. Скарыны, асобныя беларускія старадрукі, абразы.

Тыя даўнія адведзіны Свянціцкім Беларусі прынеслі і іншы плён у галіне беларуска-ўкраінскіх культурных зносін. У час адной з паездак вучоны пазнаёміўся з Цёткай, якая ў той час хавалася ад праследаванняў царскай паліцыі, дапамог ёй эмігрыраваць за мяжу, у Львоў. Тут ён прыняў самы дзейны ўдзел у жыццёвым і творчым лёсе паэтэсы-рэвалюцыянеркі: садзейнічаў ёй у паступленні на філасофскі факультэт Львоўскага універсітэта, у выданні кніг «Скрыпка беларуская», «Хрэст на свабоду», ва ўладкаванні на працу. Безумоўна, такая сяброўская падтрымка дапамагла Цёткі не толькі адужаць, але і на ўвесь час львоўскай пабыўкі захаваць творчы настрой, бадзёрасць духу. Што ж датычыць успамінаў пра Цётку, пакінутых нам І. Свянціцкім, А. Свянціцкай і М. Бордун, то яны з'яўляюцца адзінымі сведчаннямі сучасніка пра так званы львоўскі перыяд у жыцці беларускай паэтэсы. Пра ўсё гэта асабліва хочацца нагадаць сёлета, калі мы адзначаем стогадовы юбілей і І. Свянціцкага, і аўтара «Хрэста на свабоду».

В. РАГОЙША,
дацэнт.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 01153 Заказ № 680.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус. п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.